МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанка»
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанка»
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

27.05.2020 № 6-7 2061/6 эл.

На № __________ ад ________________

(для інфармавання зацікаўленых)

Аб разглядзе звароту

Мінскі гарвыканкам разгледзеў электронны зварот па пытанні прысваення інжынернаму збудаванню і састаўным часткам г.Мінска найменняў «Навалаўскі мост», «Лаўская набярэжная», «Георгіеўская вуліца» і паведамляе.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «О наименованиях географических объектов» прапановы аб прысваенні найменняў састаўным часткам населеных пунктаў могуць уносіць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі, а таксама грамадзяне пасля правядзення па гэтым пытанні мясцовага сходу або мясцовага рэферэндуму.

Разам з тым, Ваш зварот накіраваны ў камісію па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак г.Мінска з даручэннем на чарговым пасяджэнні, якое плануецца правесці ў IV квартале 2020 г., разгледзець прапановы аб прысваенні найменняў мастам горада, набярэжнай і вуліцы на тэрыторыі гістарычнага цэнтра г.Мінска. Аб выніках разгляду Вы будзеце інфармаваны дадаткова.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» сапраўдны адказ Вы маеце права абскардзіць у суд ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Кіраўнік справамі Г.М.Мацельская

Рудзікава 272 43 45